# СИСТЕМАТИЗАЦИЯ ГРАЖДАНСКОГО ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА БЕЛАРУСИ В 1920-1930-е гг. : К 100-ЛЕТИЮ ВВЕДЕНИЯ СОВЕТСКОГО ГРАЖДАНСКОГО КОДЕКСА В БССР

**_О. Ю. Юркевич_**

*ГУ «Национальный архив Республики Беларусь»,*
*пр-т Независимости, 116, 220114, г. Минск, Беларусь, yurkevichoy@gmail.com*

В статье проводится историко-правовое исследование систематизации гражданского законодательства в БССР в 1920-1930-е годы. Особое внимание уделено деятельности Народного комиссариата юстиции БССР в проведении работ по систематизации дополнений и изменений в белорусском законодательстве в области гражданского права и изданию Гражданского кодекса БССР в 1927 и 1932 годах как события, требующего дальнейшего освещения в современной исторической литературе.

**_Ключевые слова:_** гражданское право; Гражданский кодекс; кодификация; правотворчество; Народный комиссариат юстиции БССР.

# СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗЯНСКАГА ЗАКАНАДАЎСТВА Ў 1920-1930-я гг.: ДА СТАГОДДЗЯ З УВЯДЗЯННЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДЗЯНСКАГА КОДЭКСА Ў БССР

**_В. Ю. Юркевіч_**

*ДУ «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь»,*
*пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Беларусь, yurkevichoy@gmail.com*

У артыкуле праведзена гісторыка-прававое даследаванне пытанняў сістэматызацыі грамадзянскага заканадаўства ў БССР у 1920-1930-я гады. Асаблівая ўвага надаецца дзейнасці Народнага камісарыята юстыцыі БССР у правядзенні работ па сістэматызацыі дапаўненняў і змен у беларускім заканадаўстве ў галіне грамадзянскага права і выданню ў 1927 і 1932 гадах Грамадзянскага кодэкса БССР як падзеі, якая патрабуе далейшага асвятлення ў сучаснай гісторыка-прававой літаратуры.

**_Ключавыя словы:_** грамадзянскае права; Грамадзянскі кодэкс; кадыфікацыя; праватворчасць; Народны камісарыят юстыцыі БССР.

# SYSTEMATIZATION OF THE BELARUSIAN CIVIL LEGISLATION IN THE 1920-1930S: TO THE CENTENARY OF THE ENACTMENT OF THE SOVIET CIVIL CODE IN THE BSSR

**_V. Yurkevich_**

*State Institution «National Archives of the Republic of Belarus», Niezalieznasci Avenue, 116, 220114, Minsk, Republic of Belarus, yurkevichoy@gmail.com*

The article provides a historical and legal study of the systematization of civil legislation in the BSSR in the 1920s-1930s. Particular attention is paid to the activities of the People’s Commissariat of Justice of the BSSR in carrying out work to systematize additions and changes in legislation in the field of civil law and the publication of the Civil Code of the BSSR in 1927 and 1932 as an event requiring further research in modern historical studies.

***Keywords:*** civil law; Civil Code; codification; lawmaking; People's Commissariat of Justice of the BSSR.

Грамадзянскае права так ці інакш ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства. З развіццём грамадскіх адносін з'яўляюцца новыя прававыя інстытуты і іншыя элементы сістэмы грамадзянскага права. Абвяшчэнне Савецкай дзяржавы, якая адмовілася ад палітычных і сацыяльна-эканамічных асноў Расійскай імперыі, безумоўна, адбілася і на фармаванні новай, савецкай сістэмы права ў цэлым і грамадзянскага права, у прыватнасці.

Праблемы, звязаныя з вывучэннем вопыту праватворчасці ў гэтай галіне права, па-ранейшаму з'яўляюцца актуальнымі і важнымі, дапамагаючы ясней убачыць і зразумець характэрныя рысы законатворчай дзейнасці на працягу ўсёй гісторыі беларускай дзяржавы. Акрамя таго, даследаванне гісторыі развіцця грамадзянскага права ў 1920-1930-х гадах дазваляе лепш зразумець беларускае грамадства таго часу, паглядзець на яго з іншага боку.

Па асноўных аспектах гісторыі грамадзянскага права ў 1920–1930-х гг. праглядаецца шырокі спектр аўтарскіх інтарэсаў і падыходаў. Сярод буйных і яркіх навукоўцаў, якія звярнулі ўвагу на гэтае пытанне, варта адзначыць М. В. Грэдзінгера [1; 2], П. І. Стучку [3], І. Б. Навіцкага [4], Т. Я. Навіцкую [5], Ю. І. Кавалеўскую [6], І. А. Манькоўскага [7] і інш. Разам з тым неаднароднасць і ўзаемадзеянне розных даследчых пазіцый і поглядаў выклікае неабходнасць далейшага вывучэння дадзенага пытання.

Шмат каштоўных звестак па гісторыі грамадзянскага права ўтрымліваюць архіўныя крыніцы, якія адлюстроўваюць дзейнасць дзяржаўных органаў улады і кіравання БССР. У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь захоўваюцца пастановы, пратаколы пасяджэнняў, дакладныя запіскі, перапіска па юрыдычных пытаннях і іншыя дакументы. Цэлы шэраг тлумачэнняў па развіццю інстытутаў рэчавага, абавязацельнага і спадчыннага права сустракаецца ў дакументальных матэрыялах Вярхоўнага Суда БССР.

Палеміка аб Грамадзянскім кодэксе сярод беларускіх прававедаў досыць шырока прадстаўлена ў бягучай перыёдыцы тых гадоў, напрыклад, у часопісах «Савецкае будаўніцтва», «Весьці Народнага камісарыяту юстыцыі Беларускае ССР», «Рэвалюцыйная законнасьць». Аналіз крынічнай базы па гісторыі грамадзянскага права 1920–1930-х гг. дазваляе меркаваць аб яе відавай разнастайнасці, шматпланавасці і шматлікасці.

Падчас Грамадзянскай вайны і ваеннага камунізму грамадзянскі абарот у яго традыцыйным разуменні практычна знік. Выбар іншай стратэгіі грамадскага развіцця, якая атрымала назву НЭП (новая эканамічная палітыка), паспрыяў узнікненню іншых форм гаспадарання, заснаваных на таварна-грашовых адносінах. Пераход да НЭП абумовіў прыняцце ў 1922 г. у РСФСР Грамадзянскага кодэкса, які ў хуткім часе ўвялі ў дзеянне на сваіх тэрыторыях і іншыя саюзныя рэспублікі, у тым ліку і БССР. Савецкі Грамадзянскі кодэкс паставіў межы для развіцця прыватнай уласнасці; замацаваў заваёвы сацыялістычнай рэвалюцыі ў галіне эканомікі; вызначыў прывілеі сацыялістычнай дзяржавы як суб’екта грамадзянскіх праваадносін; абвясціў недапушчальнасць абмежавання права- і дзеяздольнасці, акрамя як у выпадках і парадку, вызначаных законам. Пры рэгуляванні права ўласнасці закон стаў на класавыя пазіцыі, адкрыта абараняючы права дзяржаўнай уласнасці. Кааператыўная ўласнасць таксама атрымала асобы статус. Абарона прыватнай уласнасці грамадзян мела свае асаблівасці, бо закон значна абмяжоўваў правы прыватнага ўладальніка.

На падставе пастановы Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР (ЦВК БССР) ад 2 лютага 1923 г. «О введении в действие Гражданского кодекса РСФСР» Грамадзянскі кодэкс РСФСР 1922 г. быў уведзены на ўсёй тэрыторыі Беларусі з 1 сакавіка 1923 г. [8]. У тых мясцовасцях, якія ў далейшым былі ўключаны ў склад БССР, ён лічыўся ўступіўшым у сілу з 1 студзеня 1923 г. [3, с. 20]. Гэта рэцэпцыя была праведзена без змен і абмежаванняў, таму артыкулы Кодэкса павінны былі карыстацца ў БССР законнай сілай, пакуль яны не былі б спецыяльна скасаваны законамі БССР [2, с. 20]. Тым не менш у пастанове ўжо адразу былі вызначаны некаторыя асаблівасці дзейнасці Кодэкса ў БССР. Напрыклад, здзелкі, здзейсненыя на тэрыторыі Беларусі падчас нямецкай і польскай акупацый, прызнаваліся несапраўднымі, паколькі яны супярэчылі законам, якія дзейнічалі на той момант у РСФСР, і таму названыя праваадносіны не падлягалі судовай абароне [8, арт. 3].

Кожная саюзная рэспубліка ў справе выдання законаў і кадыфікацыі мела адносную самастойнасць, калі не парушаліся пастановы, выдадзеныя ў агульнасаюзным парадку і распаўсюджаныя на ўсю тэрыторыю СССР. Як адзначаў вядомы прававед П. І. Стучка, с цягам часу рэспублікі пачалі ўносіць «не толькі паасобныя дадаткі без узаемнага ўзгаднення, але як быццам на першы погляд намерана … каб падкрэсліць сваю самабытнасць і суверэннасць» [3, с. 105].

Працэдура змянення і дапаўнення Кодэкса была даволі складаная. Дзяржаўныя органы ўлады і кіравання БССР ажыццяўлялі пошук аптымальных арганізацыйных форм і метадаў развіцця савецкага заканадаўства і кадыфікацыі. Іх дзейнасць была накіравана на падрабязную рэгламентацыю парадку ўнясення заканатворчых пытанняў на разгляд, тэрмінаў ўзгаднення, правілаў афармлення праектаў, іх рэдагаванне, візаванне і г. д. Кожны законапраект разглядаўся з усіх бакоў, на кожны з іх давалася заключэнне ўсіх зацікаўленых ведамстваў. Для ўпарадкавання заканадаўчай тэхнікі шмат было зроблена пасля стварэння ў 1924 г. Камісіі заканадаўчых праектаў пры СНК БССР, якая павінна была распрацоўваць праекты беларускіх законаў, а разам з гэтым і агульнасаюзных [9, арк. 14–17; 10, арк. 47–51]. 16 мая 1928 г. была прынята пастанова аб рэарганізацыі Камісіі заканадаўчых праектаў у Падрыхтоўчую камісію пры СНК БССР, таксама былі ўведзены пасады старшыні Падрыхтоўчай камісіі і двух яго намеснікаў [11, арк. 14].

За 1920-я гг. таксама быў унесены шэраг прапаноў аб змене і дапаўненні асобных артыкулаў Грамадзянскага кодэкса. Адны з іх былі выкліканы неабходнасцю ўзгаднення заканадаўства БССР з новымі саюзнымі законамі; другія – прабеламі ў законе ці тым, што некаторыя нормы састарэлі [12, арк. 7]. Таму з мэтай дакладнага вызначэння дзейнічаючых ў БССР норм грамадзянскага права неабходна было ўважліва прасачыць усе змены і дадаткі. Патрэба ў выданні ўласнага беларускага Грамадзянскага кодэкса пачувалася вельмі моцна.

Аднак такая карэнная перапрацоўка Грамадзянскага кодэкса не адбылася. Галоўную прычыну гэтай акалічнасці трэба шукаць у тым, што згодна з Канстытуцыямі СССР ад 31 студзеня 1924 г. і 5 снежня 1936 г. ўстанаўленне асноў грамадзянскага заканадаўства было аднесена да прадметаў ведання вышэйшых органаў Саюза. Улады БССР устрымаліся ад поўнай і карэннай перапрацоўкі Грамадзянскага кодэкса. Таму па даручэнні Прэзідыума ЦВК БССР Народны камісарыят юстыцыі БССР (Наркамюст БССР) сабраў і сістэматызаваў рад заканадаўчых змен у галіне грамадзянскага права і выдаў у 1927 г. поўны Грамадзянскі кодэкс БССР [13].

Грамадзянскі кодэкс 1927 г. нельга назваць кадыфікацыяй у звычайным сэнсе гэтага слова, бо яго ўзнікненне адбылося не ў заканадаўчым, а ў выканаўчым парадку праз Наркамюст БССР. Выдадзены Кодэкс не меў візы ЦВК БССР, і адказнасць за яго паўнату, правільнасць і сістэматызацыю цалкам была ускладзена на Наркамюст БССР [2, с. 32].

Таму ў выданні 1927 г. па-ранейшаму захоўваліся асобныя недахопы рэцыпаванага кодэкса і супярэчлівыя, састарэлыя нормы. З-за адсутнасці канчаткова ўстаноўленай, навукова-распрацаванай беларускай юрыдычнай тэрміналогіі Кодэкс быў надрукаваны на рускай мове. Грамадзянскі кодэкс 1927 г. выдання меў значна большую колькасць артыкулаў у параўнанні з Грамадзянскім кодэксам РСФСР 1922 г. і стаў складацца з 476 артыкулаў. Акрамя таго, у 1929 г. раздел аб спадчынным праве быў грунтоўна перапрацаваны і колькасць артыкулаў зноў павялічылася [2, с. 26].

Яшчэ адно адступленне праявілася ў змене нумарацыі артыкулаў, першапачаткова абазначанай у выданні 1922 г. Па меры выдання пастаноў, якімі ўводзіліся новыя артыкулы, такія навелы былі змешчаны або як увагі, або (у большасці выпадкаў) як дадаткі да ўжо існаваўшых артыкулаў з дабаўленнем да іх літар «а»,«б» , «в» ці лічбаў «1, «2», «3» і г. д. Артыкулы, якія страцілі сілу і практычнае значэнне, выключаліся з тэкста Кодэкса, але на іх месцы не перасоўваліся стаяўшыя за імі артыкулы [2, с. 26–27]. Нягледзячы на тое, што ў 1927 г. гутарка не ішла аб карэннай перапрацоўцы Кодэкса, Наркамюст БССР адыйшоў ад гэтага звычайнага і апрабаванага практыкай метада. Таму ў выданні 1927 г. артыкулы Грамадзянскага кодэкса, якія былі скасаваны беларускім заканадаўствам, саступілі свае месцы артыкулам, стаяўшым непасрэдна за імі. У выніку такога метада нумарацыя толькі першых 76 артыкулаў у новым выданні супадалі з Кодэксам РСФСР. Такім чынам, знешнія разыходжанні паміж беларускім і астатнімі грамадзянскімі кодэксамі, дзейнічаючымі ў розных краінах СССР, атрымаліся вельмі значныя.

У беларускім кодэксе меліся таксама некаторыя тэкстуальныя асаблівасці. Напрыклад, прыцягвае да сябе ўвагу артыкул 12. У ім запісана: «Лицо, которое … признано безвестно-отсутствующим, может быть объявлено пропавшим, если со дня публикации о признании его безвестно-отсутствующим прошло пять лет» [14]. Беларускае заканадаўства прызнавала невядома дзе адсутнаю асобу прапаўшай, а не памерлай. Гэта было звязана з выпадкамі, калі асоба, якая была аб’яўлена памерлай, на самой справе з’яўлялася жывой. І прававед М. В. Грэдзінгер адзначаў, што «по затронутому вопросу белорусская новелла оказалась передовой» [1, с. 553]. Але разам з тым, той прынцып, што пасля свайго вяртання асоба была пазбаўлена маёмасці, знаходзіўся ў рэзкім кантрасце з заканадаўствам астатніх савецкіх рэспублік [1, с. 553].

Пасля выдання ў 1927 г. Грамадзянскі кодэкс не мог, аднак, заставацца без змен і дапаўненняў, бо за гэты час былі прыняты агульнасаюзныя

законы, якія патрабавалі змен у грамадзянскіх кодэксах саюзных рэспублік. У 1932 г. адбылося новае ведамаснае выданне Грамадзянскага кодэкса БССР [14]. Гэта тлумачылася тым, что па-першае, выданне 1927 г. было распрадана, а па-другое, у Кодэкс было ўнесена шмат змен і дапаўненняў, якія былі раскіданы ў паасобных нумарах Збору законаў і загадаў Рабоча-сялянскага ўраду БССР. Наркамюст выдаў гэты Кодэкс на беларускай і русскай мовах. Сучаснікі звярталі ўвагу на тое, што народны камісарыят узяў на сябе вялікую адказнасць, пераклаўшы на беларускую мову артыкулы, афіцыйны тэкст якіх меўся толькі на рускай мове. Гэта мела сур'ёзнае значэнне, бо выклікала пытанне аб тым, беларускі ці рускі тэкст будзе карыстацца перавагай у выпадках, калі асобныя тэрміны ў беларускім перакладзе супярэчылі істотнаму сэнсу таго ці іншага палажэння. Напрыклад, тэрмін «требование» быў перакладзены як «прэтэнзія» (а не «патрабаванне»); паняцце «обязательство» перакладзена на беларускую мову праз слова «абавязанасць» (рускае «обязанность»), «предотвратить» (тую ці іншую небяспеку) перакладзена праз «адхіліць», між тым «адхіліць» значыць «отклонить», а не «предотвратить» і г. д. [2, с. 35–36]. Прававед М. В. Грэдзінгер прапаноўваў вырашаць гэтае пытанне на карысць рускамоўнага выдання ў тым выпадку, калі пераклад зроблены толькі Наркамюстам і не ўхвалены заканадаўчымі ўстановамі [2, с. 34].

Такім чынам, на працягу дзесяцігоддзя, якое прайшло з часу, калі Грамадзянскі кодэкс РСФСР 1922 г. атрымаў заканадаўчую санкцыю ў БССР, у яго былі ўключаны дадаткі, якія адлюстроўвалі шэраг важнейшых змен у дзяржаўнай палітыцы краіны на шляху да сацыялістычнага развіцця. Дзейнасць дзяржаўных органаў улады і кіравання БССР была накіравана на сістэматызацыю асноўных інстытутаў грамадзянскага права краіны і рэалізацыю прынцыпаў савецкай праўнай сістэмы. Вялікую ролю ў развіцці грамадзянскага права адыграла дзейнасць Наркамюста БССР, які сабраўшы і сістэматызаваўшы рад заканадаўчых змен, выдаў у 1927 г. і 1932 г. поўны Грамадзянскі кодэкс БССР. Адказнасць за яго паўнату, правільнасць і сістэматызацыю была цалкам ускладзена на Наркамюст БССР. Для характарыстыкі Грамадзянскага кодэкса БССР важнае значэнне маюць тыя артыкулы, у якіх выяўляецца асаблівасці беларускай праватворчасці ў параўнанні з іншымі савецкімі рэспублікамі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Гредингер М. О. Гражданский кодекс БССР // Вестник советской юстиции. 1927. № 16. С. 551–554.
2. Грэдзінгер М. В. Да дзясяцігоддзя грамадзянскага кодэкса ў БССР. Мінск: Выд-ва Бел. акад. навук, 1933.
3. Стучка П. І. Уводзіны ў тэорыю грамадзянскага права. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932.
4. Новицкий И. Б. История советского гражданского права. М.: Государственное издательство юридической литературы, 1957.
5. Новицкая Т. Е. Гражданский кодекс РСФСР 1922 года. М.: ИКД «Зерцало-М», 2002.
6. Ковалевская Ю. И. Граждане как субъекты гражданского права: опыт кодификации 60-х годов XX века // Юридический журнал. 2009. № 4. С. 9–13.
7. Маньковский И. А., Вабищевич С. С. Гражданское право. Общая часть: в 3 т. Т. 1. Введение в гражданское право. Минск: Междунар. ун-т «МИТСО», 2013.
8. 8. О введении в действие Гражданского Кодекса РСФСР: Постановление Президиума ЦИК БССР, 2 февр. 1923 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства ССРБ. 1923. № 3. Ст. 29.
9. НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 176.
10. НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 425.
11. НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 498.
12. НАРБ. Ф. 99. Воп. 2. Спр. 335.
13. Гражданский кодекс БССР. Минск: Издательский подотдел отдела законодательных предположений НКЮ БССР, 1927.
14. Грамадзянскі кодэкс БССР: [са зменамі з 1927 па 1-е лістапада 1932 г. ]. Мінск: НКЮ БССР, 1932.